УДК 636.2.084[085.13]14

І. А. КРАСКО, А. А. ХАЧАНКОЎ

ТОРФАТЛУШЧАПРАТЭІНАВЫЯ ДАБАЎКІ Ў КАМБІКАРМАХ ДЛЯ СВІНЕЙ

Шматлікія даныя айчыннай і замежнай навукі і практыкі сведчаць аб магчымасці эфектыўнага выкарыстання ў саставе камбікармоў адходаў перапрацоўкі сельскагаспадарчай і прамысловай сыравіны. Адны з іх з'яўляюцца важнейшымі сродкамі для балансавання рацыёнаў па пратэіну, энергіі, мінеральных элементах, іншыя служаць для частковай замены дарагіх дэфіцытных бялковых кармоў [1, 3].

У камбікармах для свіней у якасці пратэінавай дабаўкі шырока выкарыстоўваецца рыбная мука. Але, згодна з літаратурнымі данымі, нягледзячы на тое што каля трэці сусветнага ўлову рыбы ідзе на корм жывёле, далейшага пашырэння кармавой базы свінагадоўлі за кошт рыбнай мукі не будзе з прычыны збяднення запасаў сусветнага акіяна [2]. Альтэрнатыўнай бялковай сыравінай традыцыйным бялковым кармам з'яўляюцца адходы боень, мясаперапрацоўчых заводаў, ветэрынарна-санітарных утыльзаводаў. Перш за ўсё выклікае цікавасць іх невялікі сабекошт. Адзінка пратэіну кармоў, якія нарыхтаваны з гэтых адходаў, у некалькі разоў танней за адзінку пратэіну рыбнай мукі.

Адным з фактараў, які стрымлівае шырокае прымяненне прадуктаў перапрацоўкі ветэрынарна-санітарных утыльзаводаў і мясакамбінатаў у вытворчасці камбікармоў і кармавых сумесей, з'яўляецца значная колькасць тлушчу, які яны змяшчаюць. Такія кармы маюць кароткі тэрмін захавання і патрабуюць стабілізацыі тлушчу антыаксідантам. Акрамя таго, неабходны надзейныя сарбенты для надання кармам тэхналагічных уласцівасцей.

Цэнтральны НДІ комплекснага выкарыстання водных рэсурсаў пра-

Табліца 1. **Схема навукова-гаспадарчага доследу**

Група	Колькасць галоў	Працягласць доследу	Асаблівасці кармлення
I (кантрольная)	16	76 1—50 51—76	Камбікорм СКС-4 Камбікорм СКС-5
II (доследная)	16	76	Тыя ж камбікармы з торфатлушчапратэінавай дабаўкай вытворчасці Лагойскага ветэрынарна-санітарнага утыльзавода
III (доследная)	16		Тыя ж камбікармы з торфатлушчапратэінавай дабаўкай вытворчасці Мінскага мясакамбіната

Табліца 2. **Хімічны састаў кармоў**

Паказчык	Корм							
	ТТПД-1	ТТПД-2	камбікорм СКС-4			камбікорм СКС-5		
			стандартны	з ТТПД-1	з ТТПД-2	стандартны	з ТТПД-1	з ТТПД-2
Сухое рэчыва, %	86,28	86,21	85,52	85,97	85,87	85,95	86,73	85,61
У сухім рэчыве змяшчаецца, %:								
арганічнага рэчыва	93,21	93,48	94,30	95,69	94,91	94,96	96,18	96,18
пратэіну	26,06	26,94	21,88	22,13	22,31	20,83	21,25	20,81
тлушчу	31,24	45,33	3,81	6,63	7,21	4,39	5,86	6,33
клятчаткі	4,5	5,97	5,41	4,93	5,21	8,11	7,99	7,18
попелу	6,79	6,52	5,70	4,31	5,09	5,04	3,82	3,82
БЭР	14,97	39,27	60,34	60,96	63,81	61,65	61,08	61,86
кальцыю	2,67	2,36	0,99	0,95	0,85	0,90	0,88	0,94
фосфару	1,12	0,67	0,70	0,75	0,68	0,85	0,80	0,82
Вітамінаў:								
А, тыс. І.Адз/г	14,03	9,97	6,23	3,67	4,61	6,07	3,5	4,51
Е, мг/кг	47,1	14,1	43,35	43,03	42,9	53,38	49,76	53,37
B_2, мг/кг	7,0	12,0	5,5	6,0	5,75	5,25	5,75	4,0
РР, мг/кг	31,17	30,0	61,6	62,8	59,9	38,2	34,3	32,5
караціну, мг/кг	4,07	4,86	5,99	4,76	4,07	8,47	9,6	10,26

панаваў у якасці напаўняльніка для падобных прадуктаў верхавы сфагнавы торф са ступенню раскладання не больш за 20% у колькасці не больш за 9% ад масы сыравіны, які, па папярэдняй задуме, будзе выконваць функцыі сарбента і антыаксіданта.

У сувязі са сказаным вышэй мэтай нашых даследаванняў з'яўлялася вывучэнне магчымасці замены рыбнай мукі ў камбікармах для гадавання свіней торфатлушчапратэінавымі дабаўкамі ў эквівалентных па пратэіну суадносінах.

Для вырашэння пастаўленай задачы ў ДВГ «Будагова» Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці праведзены навукова-гаспадарчы дослед метадам груп на племянных свінках-аналагах па паходжанні, узросце, жывой масе. Групы сфарміраваны з добра развітых, клінічна здаровых жывёлін ва ўзросце 50—60 дзён. Дослед працягваўся 76 дзён да племяннога продажу свінак па схеме (табл. 1).

Згодна са схемай доследу, свінкі І (кантрольнай) групы атрымлівалі на працягу 50 дзён стандартны камбікорм СКС-4, а затым — СКС-5. Жывёліны ІІ і ІІІ (доследных) груп атрымлівалі ў саставе камбікармоў замест рыбнай мукі ТТПД-1 і 2 у колькасці, эквівалентнай па пратэіну і мінеральных рэчывах (табл. 2). Кармы скормлівалі ў выглядзе мешанак. Умовы ўтрымання і кармлення былі аднолькавымі і адпавядалі прынятай на комплексе тэхналогіі. Партыі камбікармоў, якія вывучаліся, былі нарыхтаваны на Задняпроўскім камбікормавым заводзе па адпаведных рэцэптах у адпаведнасці са схемай доследу (табл. 3).

Новыя кармавыя сродкі, торфатлушчапратэінавыя дабаўкі маюць даволі высокую колькасць арганічных рэчываў, а іменна пратэіну і тлушчу. Тлушчу асабліва шмат у ТТПД вытворчасці Мінскага мясакамбіната. Высокая колькасць клятчаткі і мінеральных рэчываў абумоўлена тым, што торфатлушчапратэінавыя дабаўкі нарыхтоўваюцца з цэлых утылізаваных туш і трупаў жывёлы (са змесцівам кішэчніка). Аднак выключэнне са стандартных рэцэптаў камбікармоў не толькі рыбнай мукі, але і мелу, фасфату кальцыю дало магчымасць ідэнтыфікаваць новыя рэцэпты камбікармоў са стандартным па колькасці ў іх кальцыю і фосфару і па суадносінах іх паміж сабой як найбольш лімітаваных мікраэлементаў. Нязначна адрозніваюцца камбікармы, якія вывучаюцца, і па іншых пажыўных рэчывах.